# Недаплацілі 22 тысячы рублёў падаткаў

## Падрабязнасці справы Фядыніча і Комліка

**Упраўленне Следчага камітэта па Мінску прад'явіла канчатковае абвінавачанне старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці Генадзю Фядынічу, а таксама галоўнаму бухгалтару гэтага аб'яднання Ігару Комліку ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага ч. 2 арт. 243 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — ухіленне ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры.**

Як расказаў **начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Сяргей КАБАКОВІЧ**, абвінавачаныя Фядыніч і Комлік, парушаючы беларускае заканадаўства, адкрылі рахунак у банку Літвы, на які ў 2011 годзе ад нерэзідэнтаў Беларусі паступалі грашовыя сродкі ў замежнай валюце. «У далейшым гэтыя грошы Ігар Комлік здымаў з рахунку, а таксама з дапамогай членаў прафсаюза грашовыя сродкі дастаўляліся на тэрыторыю Беларусі. Тут неабходна адзначыць, што пасля перасячэння мяжы яны вярталіся Комліку і Фядынічу, — праінфармаваў Сяргей Кабаковіч. — Схема дастаткова простая: Комлік перадаваў грашовыя сродкі ў асноўным у канвертах і той суме, якую няма неабходнасці дэклараваць пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы Беларусі. Папросту кажучы — дазволеная сума».

Факты паступлення грошай не адлюстроўваліся ў фінансавай справаздачнасці грамадскага аб'яднання і падатковай дэкларацыі арганізацыі.

Акрамя таго, у матэрыялах крымінальнай справы маюцца звесткі, якія змяшчаюць прыкметы супрацьпраўнай дзейнасці Фядыніча і Комліка аж да 2017 года, па якіх у цяперашні час праводзіцца дадатковая праверачныя мерапрыемствы, у тым ліку з прыцягненнем органаў фінансавых расследаванняў для разліку сум ухілення ад выплаты падаткаў за гэты перыяд часу.

Сяргей Кабаковіч падкрэсліў, што ў ходзе следства атрымана інфармацыя аб нямэтавым выдаткоўванні грашовых сродкаў, якія паступілі ад замежных партнёраў, а таксама аб фальсіфікацыі дакументаў для справаздачы перад імі. Ён прадэманстраваў сканаваны дакумент з пячаткай банкаўскай установы — з дапамогай праграмы Photoshop з яе быў выдалены подпіс службовай асобы банка.

У цяперашні час абвінавачаныя знаёмяцца з матэрыяламі крымінальнай справы, пасля чаго яна будзе перададзена пракурору для накіравання ў суд. Зараз мера стрымання не звязаная з пазбаўленнем волі, аднак яна можа быць зменена пры наяўнасці пэўных абставін, якія замацаваны ў заканадаўстве — напрыклад, калі абвінавачаныя паспрабуюць схавацца ад следства.

Аб «цане пытання» падрабязна расказаў і **намеснік начальніка ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Мінскай вобласці і Мінску Валерый ШЧАРБУН**:

— У адпаведнасці з паўнамоцтвамі, нададзенымі законамі аб органах фінансавых расследаванняў, на падставе матэрыялаў, прадстаўленых упраўленнем Следчага камітэта па Мінску, праведзены разлік сумы неаплачаных падаткаў прафсаюза РЭП у 2011 годзе. Так, у 2011 годзе на рахунак прафсаюза ў адным з банкаў Літвы паступіла больш за 140 тысяч еўра. Гэтыя грашовыя сродкі не былі адлюстраваны ў бухгалтарскіх рэгістрах, а таксама ў падатковай справаздачнасці прафсаюза, у выніку чаго адбылося ўхіленне ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры, сума неаплачаных падаткаў склала 22 тысячы рублёў з улікам дэнамінацыі. У цяперашні час намі праця́гваецца праводзіцца праверкі паўнаты і своечасовасці выплаты падаткаў прафсаюза ў наступныя гады.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ Надвор'е

# Вось вам і дажджы рознай інтэнсіўнасці

**Даволі няўстойлівае надвор'е з дажджамі і навальніцамі чакаецца ў краіне на гэтым тыдні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Сёння ўдзень атмасферныя франты абумовяць на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Максімальная тэмпература паветра будзе ад плюс 18 да плюс 24 градусаў. У сераду франтальныя падзелы, якія змяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы, абумовяць пераважна па заходняй частцы Беларусі кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці, у асобных раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—14 цяпла, удзень у асноўным будзе ад плюс 20 да плюс 26 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 19 цяпла.

Захаваецца няўстойлівае надвор'е і ў чацвер, калі на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тады ў асобных раёнах прагрымяць навальніцы, удзень па паўднёвым захадзе — з парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—15 цяпла, удзень чакаецца ад плюс 20 да плюс 26 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах з-за шчыльнай воблачнасці і дажджоў будзе не вышэй за плюс 16—19 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—13 цяпла, удзень прагназуецца ад плюс 16 да плюс 22 градусаў, па ўсходзе краіны паветра прагрэецца да 24 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Небяспека

# ТРАГЕДЫЯ НА ДАРОЗЕ

## У аварыю пад Камянцом трапілі дзеці з Украіны: адзін загінуў, яшчэ шасцёра — у бальніцы

**У нядзелю каля сямі раніцы на дарозе Р98 Камянец—Шарашова—Свіслач каля вёскі Мартынюкі мікрааўтобус урэзаўся ў пагрузчык «Амкадор». Падрабязнасці расказала афіцыйны прадстаўнік ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама Наталля САХАРЧУК:**

— ДТЗ адбылося за некалькі кіламетраў ад Камянца. 42-гадовы кіроўца мікрааўтобуса, грамадзянін Украіны, здзейсніў сутыкненне з папутным пагрузчыкам, якім кіраваў 48-гадовы мясцовы жыхар. У выніку 13-гадовы хлопчык, які сядзеў на пярэднім пасажырскім сядзенні, загінуў. Яшчэ шасцёра пасажыраў 2003—2004 гадоў нараджэння былі дастаўлены ў Камянецкую цэнтральную раённую бальніцу.




**Начальнік упраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктар МІХАЛОЎСКІ** расказаў, што дзеці паступілі з цяжкімі траўмамі — чэрапна-мазгавымі, пераломам сцягна, з ранамі на галаве і на твары. Усім была аказана першасная медыцынская дапамога. Тым часам з Брэста пад'ехалі дзіцячыя рэаніматолагі, дзіцячыя хірургі, дзіцячыя траўматолагі. Прыбыла брыгада медыкаў з Мінска. Тыя дзеці, якія былі транспартабельныя, апэратыўна перавезены з Камянца ў Брэст. Аднаго везці было нельга, складаную аперацыю яму рабілі ў Камянцы. Пасля таго як стан хлопчыка ўдалося стабілізаваць, яго таксама даставілі ў Брэст. Усе пацярпелыя знаходзяцца ў абласной бальніцы.

Для вырашэння арганізацыйных пытанняў у Брэст прыехаў і першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый Піневіч. Пад асабісты кантроль узяў сітуацыю міністр аховы здароўя Валерый Малашка, паведамляецца на сайце ведамства.

Стала вядома, што дзеці, якія ехалі ў тым злашчасным мікрааўтобусе, — юныя ўкраінскія футбалісты. Яны вярталіся з неафіцыйнай паездкі ў Польшчу, дзе сустракаліся з мясцовымі футбалістамі. Хлопчык, які загінуў, пражываў у ўкраінскім горадзе Сумы. Яго бацькі адразу ж выехалі ў Беларусь. Прыехалі і бацькі тых дзяцей, што знаходзяцца ў бальніцы.

Следчы камітэт распачаў крымінальную справу. Украінскі вадзіцель затрыманы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ На слыху

# На 22 гады за краты

## У Магілёве вынеслі прысуд па новым злачынстве «хлопца з бензапілой»

**22 гады пазбаўлення волі — такое пакаранне для Уладзіслава Казакевіча вынес учора Магілёўскі абласны суд. Першыя пяць гадоў ён павінен будзе правесці ў турме. Астатнія — у папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.**



Нагадаем, што Уладзіслаў Казакевіч падчас адбывання тэрміну ў Шклоўскай папраўчай калоніі (за напад на людзей з бензапілой у гандлёвым цэнтры «Еўропа» ў Мінску) здзейсніў новае злачынства: параніў аднаго з супрацоўнікаў шклоўскай калоніі нажом у галаву. Яму было прад'яўлена абвінавачанне ў спробе забойства двух чалавек пры выкананні імі службовых абавязкаў і напад на прадстаўніка адміністрацыі папраўчай установы.

Новае злачынства адбылося крыху больш чым праз год з асуджэння Казакевіча за разню ў гандлёвым цэнтры. Тады ён атрымаў 15 гадоў пазбаўлення волі. У момант забойства Казакевічу было ўсяго 17 гадоў, і пакаранне, якое яму далі, было максімальным.

Як адзначыў **дзяржабвінаваўца Андрэй КАВАЛЁЎ**, рашэнне суда амаль цалкам супала з пазіцыяй дзяржаўнага абвінавачання як па артыкулах, так і па меры пакарання. На заўвагу, што абарона і бацька падсуднага лічаць маладога чалавека хворым і настойваюць на яго лячэнні, а не асуджэнні, Андрэй Кавалёў адказаў: «Калі я падтрымліваў абвінавачанне, значыць, я згодны з тым, што абвінавачаны знаходзіцца пры свядомасці і можа несці крымінальную адказнасць. Па справе праведзены дзве судовыя псіхолага-псіхіятрычныя экспертызы, яны, я мяркую, навукова абгрунтаваныя, суадносяцца з іншымі доказамі па справе і не выклікаюць сумнення». Ён таксама растлумачыў, чаму менавіта такое пакаранне было вызначана Казакевічу:

— Максімальны тэрмін у гэтым выпадку — 25 гадоў пазбаўлення волі. Тое, што яму можа пагражаць пажыццёвае пакаранне, як пісалі некаторыя сродкі інфармацыі, — гэта памылка. Калі вы адкрыеце Крымінальны кодэкс, там выразна прапісана ў частцы 1 артыкула 59, што выключная мера пакарання — смяротная кара або пажыццёвае зняволенне — прымяняецца толькі за цяжкія злачынствы, звязаныя з пазбаўленнем чалавека жыцця з абцяжваючымі абставінамі. У гэтым выпадку ўсе засталіся жывыя.

Між тым **бацька Уладзіслава Казакевіча** настойвае, што яго сын хворы:

— Гэта высветлілася яшчэ на першай экспертызе ў снежні 2016 года, — адзначыў ён. — У заключэнні было напісана, што ў яго змешанае расстройства. Але я не так глыбока ведаю, што гэта такое. Калі пачалі правяраць дакументы, высветлілася, што Уладу яшчэ пасля лячэння ў Навінках (да трагедыі ў гандлёвым цэнтры) быў выстаўлены дыягназ: шызатыповае расстройства. Да ўрачоў мы тады звярнуліся пасля таго, як ён 4 разы спрабаваў пакончыць з сабою. Але спецыялісты не палічылі патрэбным даць рэкамендацыі, як яго дагледзець, і чым гэта небяспечна.

Прысуд новаму злачынству Улада Казакевіча вынесены. На працягу 10 дзён з моманту атрымання копіі рашэння суда яго можна будзе абскардзіць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

■ Сацыяльны клопат

# Прэмія за ініцыятыву і добрыя вынікі

## Прафсаюз лічыць неабходным змяніць сістэму аплаты ў бюджэтнай сферы

**Суадносіны заробку бюджэтнікаў і заробку ў цэлым па краіне складаюць 76 працэнтаў. Па норме ж, прапісанай у генеральным пагадненні, гэты паказчык павінен быць не ніжэйшым за 80 працэнтаў.**

— Сярэдні заробак у работнікаў бюджэтных арганізацый у студзені — сакавіку склаў 686,6 рубля. Але гэта «сярэдняя тэмпература па бальніцы». Такія лічбы атрымаліся ў выніку сярэдняга арыфметычнага ўсіх супрацоўнікаў — і высокааплатных, і нізкааплатных, — а таксама з улікам каэфіцыента сумяшчальніцтва. На наш погляд, толькі аптымізацыяй функцый і колькасці занятых праблемы заробку не вырашыць. Трэба ў корані змяняць сістэму аплаты ў бюджэтнай сферы, — узнімае пытанне **старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Тацццяна ФІЛІМОНАВА.**

Міністэрствам працы і сацабароны ўжо падрыхтаваны нарматыўныя прававыя акты з канкрэтнымі прапановамі. У іх прадугледжваецца ўстанавіць базавую стаўку (замест тарыфнай стаўкі першага разраду) ад ўзроўні бюджэту пражыткова мінімуму, перайсці ад цэнтралізаванага да змяшанага рэгулявання аплаты працы, пашырыць правы кіраўнікоў бюджэтных арганізацый у стымуляванні падначаленых за ініцыятыву і паспяховасць.

Яшчэ адна прапанова прафсаюзаў — замацаваць заканадаўча норму аб працягненні ці перазаключэнні кантрактаў з добрасумленнымі работнікамі.

— Такая норма сёння ўключана ў якасці рэкамендацыйнай у генеральнае пагадненне. Таксама яна перанесена ў тарыфныя пагадненні паміж Міністэрствамі культуры, інфармацыі, спорту і турызму і Цэнтральным камітэтам галіновага прафсаюза на 2016—2018 гады і многія калектыўныя дагаворы. Але для таго, каб норма прымянялася паўсюдна, каб выключыць суб'ектывізм пры прыняцці рашэння аб працягненні працоўных адносін з работнікамі, лічым неабходным замацаваць яе ў Працоўным кодэксе, — кажа Тацццяна Філімонава.

За мінулы год колькасць Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму павялічылася на 257 чалавек. Пярвічных прафсаюзных арганізацый стала больш на 73.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■